ДУК «ЦБС Асіповіцкага раёна»
Раённая дзіцячая бібліятэка

# СКАРБЫ РАДЗІМЫ,
# або Чароўны свет кніг Уладзіміра Ягоўдзіка



*Ягоўдзік, У. Адмірал і яго каманда / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2010. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Хто сказаў, што Беларусь не марская дзяржава? У нас таксама ёсць свае адміралы. І самы вядомыя з іх…***

*Ягоўдзік, У. Беларуская зіма / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2012. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Калі падае снег, кажуць людзі, Бог сцеле пярыну, каб на палетках не памерзла жыта, а заадно мосціць дарогі, каб вазіць сена на санях. З надыходам зімы, калі не сядзіш дома, можна знайсці шмат цікавых забаў. Катайся на лыжах, гуляй з хлопцамі ў хакей, ляпі снегавікоў, або непрыступную крэпасць, шпурляйся снежкамі… Вось такая яна беларуская зіма***

Ягоўдзік, У. Вячэра для вожыка / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2013. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).




**Вось дык дзіўны шавец! На спіне сто іголак, а шыць не ўмее. Кожны ведае, што гэта – вожык. Ён мае не сто іголак, а ў сто раз больш, прынамсі, так падлічылі вучоныя. А што ў вожыка сёння на вячэру?**

*Ягоўдзік, У. Зайцаў хлеб / Уладзімір Ягоўдзік. —
Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2013. — 11 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Незайдроснае зайцава жыццё, шмат у яго ворагаў: і воўк, і ліса, і рысь… Нездарма людзі кажуць, што ў зайца – самае маленькае сэрца. Гасподзь зляпіш яму доўгія вушы, а на сэрца не хапілы гліны. Тады Бог адарваў ягоны хвосцік, пакінуўшы невялічкі адростак, і зрабіў звярку сэрца. З таго часу заяц вельмі палахлівы, а ратуюць небараку…***

*Ягоўдзік, У. Зачараваная Свіслач / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2018. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Зірніце на карту і вы пераканаецеся: многія гарады Беларусі, а таксама гарады ў іншых краінах, узніклі каля вялікіх і малых рэк.***

***Рэкі тады служылі надзейнымі дарогамі паміж асобнымі плямёнамі, былі багатыя рыбай, вадзянымі звярамі і птушкамі, таму шчодра карміді і паілі людзей. Можна ўпэўнена сказаць, што менавіта на рачных і азёрных берагах пачалася гісторыя чалавецтва, у тым ліку і нашага народа.***

*Ягоўдзік, У. Крылатыя суседзі / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2018. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).*




*За акном – сонечны зімовы ранак. Навокал у казачнай шэрані стаяць здранцвелыя дрэвы. Выбежыш на вуліцу – шчокі апячэ калючы злюка-мароз. Міжволі схаваеш нос у каўнер. А яны сядзяць на галінках вішні ці рабіны, як пушыстыя камячкі, і бадзера крычаць на ўвесь двор: "Ціў-ціў!.. Жыў-жыў!.. Ціў-ціў!.. Жыў-жыў!.." А яны – гэта…*

*Ягоўдзік, У. Лясная ласуня / Уладзімір Ягоўдзік. —
Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2016. — 11 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Куніца-куня, спрытная ласуня, не абмінае гнёзды птушыныя, нападае на вавёрак і зайцоў. А куніцын кажушок – жаданая здабыча для паляўнічага. Паспрабуй дагнаць яе, калі яна скача па дрэвах, нібыта маланка.***

*Ягоўдзік, У. Нацыянальны парк “Белавежская пушча” / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2009. — 11 с. — (Скарбы Радзімы).*




***На зямлі немала цудоўных тварэнняў прыроды, якія сталі сімваламі цэлых краінаў. Напрыклад, гара Фудзі ў далёкай Японіі. У суседняй Расіі – рака Волга. А возера Балатон адразу нагадвае пра Венгрыю.***

***Сімвал жа нашай беларусі – Белавежская пушча, бадай, самы вялікі і стары лясны абшар у цэнтральнай Еўропе, дзе зберагліся і высокія, аж да аблокаў, бары, і магутныя векавыя дубровы, і светлыя бярозавыя гаі.***

*Ягоўдзік, У. Нацыянальны парк “Нарачанскі” / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2011. — 11 с. — (Скарбы Радзімы).*




***Возера Нарач завуць беларускім морам. Гэта самае вялікае возера ў нашай краіне. Пра Нарач складзена шмат надзвычай прыгожых легенд і паданняў. Іх шэпчуць, калі прыслухацца, нават нарачанскія хвалі…***

*Ягоўдзік, У. Начны князь / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2013. — 10 с. — (Скарбы Радзімы).*




*Няўтульна і вусцішна ў начным лесе. Кожны пень ці ядловец здаецца ваўком або мядзведзем. Птушкі — і тыя даўно замоўклі, сцішыліся. — Угу-гу-гух!.. – раптам хтосьці зарагатаў паблізу. — Угу-гу-гух!.. Хто гэта?*

*Ягоўдзік, У. Ягадная паляна / Уладзімір Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2016. — 11 с. — (Скарбы Радзімы).*




***"Па кустах хаджу і палясах, па імхах і па балотах, і куды я ні хаджу – аніколі не блуджу. З сонцам – па сонцы, з месяцам – па месяцы, з зоркамі – пад Божымі свечкамі. Хаджу не блуджу, табе, гаспадар лясны, кланяюся і прашу: адкасніся ад мяне, адхіліся, у пень або корч абярніся"***

***А цяпер – гайда па ягадных мясцінах! Нам абавязкова пашанцуе.***

**Уладзімір Ягоўдзік напісаў яшчэ шмат цікавых кніг з гэтай серыі. Выбірайце на свой густ, прапануйце сваім сябрам і знаёмым.**

# ДЗЯКУЙ ЗА ЎВАГУ!